# ГАРТАЮЧЫ ВЕЧНЫЯ СТАРОНКІ

Учора пашчасціла патрымаць у руках сапраўды вечную кнігу — «Чатыры кнігі царстваў» — адно з выданняў славутага Францыска Скарыны, ажыццёўленае ім у Празе ў 1518 годзе. З нагоды свята беларускага пісьменства і друку ў Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь адкрылася выстава старадрукаў «Гартаючы вечныя старонкі».

Таццяна Іванаўна Рошчына — загадчыца аддзела рукапісаў, старадрукаў і рэдкай кнігі паведаміла наведвальнікам, што пераплёт кнігі зроблены значна пазней. Паказала, што некалькі першых старонак адсутнічае.

Увогуле дзіўнае пачуццё выклікаюць пажаўцелыя старонкі, якім амаль 5 стагоддзяў. Міжволі адчуваеш сябе непарыўна звязаным з далёкімі продкамі, з нейкай таямніцай гісторыі.

На адкрыццё выстаўкі прыйшлі міністр культуры і друку Анатоль Бутэвіч і старшыня Беларускага фонду культуры пісьменнік Іван Чыгрынаў. «Любая дзяржава моцная сваёй духоўнасцю, — сказаў А. Бутэвіч, — а тут, на выстаўцы, мы можам бачыць усю гісторыю развіцця беларускага пісьменства, якая ўвабрала ў сябе высокую духоўнасць і пранесла яе праз стагоддзі».

Як адзначыла намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Ірына Аляксандраўна Прылішч, у помнікаў беларускага пісьменства, якімі з'яўляюцца старадрукі, вельмі складаны лёс. Яны гінулі ў полымі войнаў, знішчаліся цемрашаламі, іх вывозілі ў чужыя краіны. І таму вельмі многа кніг, летапісаў аказалася ў замежных калекцыях і зборах. Цяпер Нацыянальная бібліятэка разам з Фондам культуры, іншымі арганізацыямі актыўна працуе па праграме «Вяртанне».

Што ж прадстаўлена на цяперашняй выстаўцы?

— Некалькі дзесяткаў старадрукаў, — кажа Таццяна Рошчына. — Хаця ў нашых фондах іх значна больш. Паказваем толькі самае каштоўнае, цікавае, што мела этапнае значэнне для развіцця пісьменства.

Наведвальнікі змогуць убачыць найбольш прыгожа аздобленыя рукапісы, якія або па паходжанню, або па мове звязаны з Беларуссю.

Сярод старадрукаў вялікую цікавасць уяўляюць азбукі і буквары, якіх захавалася вельмі мала. Прычына зразумелая — імі карысталіся дзеці, а вучэбная літаратура заўсёды мае кароткае жыццё. Таму раю звярнуць увагу на буквар канца XVIII стагоддзя, які вядомы сёння толькі ў двух асобніках: у нас і ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы.

Таксама цікава будзе тым, хто прыйдзе на выставу, убачыць на свае вочы «Вянок» Максіма Багдановіча з яго аўтографам, першыя выданні Коласа, фундаментальныя даследаванні вучоных XIX — пачатку XX ст. па гісторыі беларускай мовы, літаратуры.

«Не, мы не бедныя, — багатыя людзі, якім проста адбіла памяць аб тым, кім былі і што мелі». А таму калі-нікалі ўсё ж трэба патрымаць у руках кнігі, выдадзеныя далёкімі продкамі, наведаць мясціны, асвечаныя іх таленавітай прысутнасцю.

**Таццяна АНТОНАВА.**